першакурснікаў, з якімі нам давялося працаваць, толькі 10% ведаюць нормы выстаўлення адзнак.

Складаючыя вобраза высокапрафесійнага настаўніка шматбаковыя і шматузроўневыя, і дасягнуць іх адразу немагчыма, аднак калі ўжо сёння студэнт-практыкант ці малады спецыяліст будзе ставіць мэты па авалодванні імі, у будучым Беларусь атрымае высокападрыхтаваных спецыялістаў-настаўнікаў, якія змогуць уплываць на жыццё нашай краіны.

**Л.А.Дзямешка,** *прафесар*
**Н.У.Клімянкова,** *дацэнт*
**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

## САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ КУРСА «АБСЛУГОЎВАННЕ ЧЫТАЧОЎ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навучанне ў ВНУ дае будучаму бібліятэкару фундаментальную агульнаадукацыйную і прафесійную падрыхтоўку. Удасканаленне прафесійнага навучання спецыялістаў патрабуе эфектыўнай педагагічнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі, якая забяспечвае набыццё імі ведаў, навыкаў і ўменняў з улікам задач бібліятэчнай практыкі.

Працэс навучання прадугледжвае дзве часткі – базавую і рэцэптурную. Першая ўключае фундаментальныя веды, другая накіравана на выкананне функцый канкрэтнай дзейнасці. Заўважым, што без інтэграцыі спецыяльных дысцыплін з дысцыплінамі агульнаадукацыйнага блока немагчыма падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Курс «Абслугоўванне чытачоў» прадугледжвае вывучэнне студэнтамі тэарэтычных асноў (праблем сацыялогіі, псіхалогіі чытання, тэорыі абслугоўвання і інш.). Акрамя гэтага, задачы прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў – абслугоўванне кары-

стальнікаў, прапаганда кнігі – патрабуюць ад іх комплексу практычных уменняў і навыкаў, дзякуючы якім забяспечваецца авалоданне метадамі і формамі абслугоўвання. У раздзеле курса «Псіхалагічныя аспекты вывучэння чытачоў» канкрэтызуюцца веды студэнтаў, атрыманыя імі пры вывучэнні агульнай псіхалогіі, гэтыя веды паглыбляюць і пашыраюць матэрыял раздзела курса «Абслугоўванне чытачоў». Пры вывучэнни тэмы «Псіхалогія чытача і чытання» аналізуюцца псіхалагічныя аспекты функцыянавання сістэмы «кніга–бібліятэка–чытач», разглядаюцца пытанні дыферэнцыяцыі чытачоў на чытацкія катэгорыі, групы, тыпы. Пры гэтым выкарыстоўваюцца бібліятэказнаўчыя даследаванні апошніх гадоў, матэрыялы дыскусій.

Студэнты самастойна праводзяць тыпалагічны аналіз чытачоў, выкарыстоўваючы іх тыпалогію, распрацаваную спецыялістамі, або прапануюць і абгрунтоўваюць сваю тыпалогію. Прычым аналіз праводзіцца і з пазіцыі чытача, і з пазіцыі бібліятэкара. Самастойна будучыя бібліятэкары вывучаюць і спосабы псіхолага-педагагічнага ўздзеяння на карыстальнікаў з рознай ступенню чытацкай падрыхтоўкі з выкарыстаннем розных методык.

Вывучэнне матэрыялу курса «Абслугоўванне чытачоў» прадугледжвае "апісанне канчатковага стану", г.зн. дакладнае ўяўленне таго, што павінен ведаць і ўмець студэнт у выніку вывучэння кожнай тэмы і ўсяго курса ўвогуле. Таму адным з асноўных момантаў аптымізацыі працэсу авалодання студэнтамі метадамі і формамі работы з карыстальнікамі з'яўляецца аналіз, з іх пункту гледжання, неабходных для яго рэалізацыі ўменняў і навыкаў. Напрыклад, такая форма работы, як гутарка аб прачытанай кнізе, мае дакладную педагагічную накіраванасць, і методыка яе правядзення патрабуе фарміравання гнастычных і камунікатыўных уменняў, з аднаго боку, а з другога – уменняў характарыстыкі твора (аналіз мастацкага твора, вызначэнне ідэйнага зместу і інш.). Камунікатыўныя ўменні, неабходныя для правядзення гутарак аб прачытанай кнізе, уключаюць уменні прыцягнуць карыстальніка да гутаркі, у тактычнай форме пака-

заць яго недахопы ва ўспрыманні твора і магчымыя шляхі дапамогі ў гэтым выпадку, уменні бібліятэкара весці і падтрымліваць гутарку.

На лабараторных занятках пры самастойнай рабоце студэнты выкарыстоўваць набытыя веды. Для развіцця ўменняў і навыкаў у выкладанні курса выкарыстоўваюцца не толькі пасіўныя, але і актыўныя метады навучання. Актыўныя метады навучання (ролевыя або дзелавыя гульні, аналіз канкрэтных сітуацый і інш.) дазваляюць развіваць навыкі самастойнага мыслення, уменні прымаць рашэнні і абгрунтоўваць іх.

Выкарыстанне ролевых і дзелавых гульняў асабліва важна пры вывучэнні пытанняў псіхалогіі бібліятэкара і псіхалогіі стасункаў бібліятэкара з карыстальнікам. Для аналізу канкрэтных сітуацый стасункаў выкарыстоўваецца зборнік сітуацый. У ім практычныя сітуацыі групуюцца па трох відах: бібліятэкар – карыстальнік; бібліятэкар – бібліёграф; бібліятэкар – кіраўніцтва бібліятэкі.

Распрацавана таксама методыка аналізу канкрэтных сітуацый, якая дапамагае высветліць: 1) сутнасць канфлікту, паводзіны бакоў, якія канфліктуюць; 2) прычыны ўзнікнення канфлікту (сацыяльныя, псіхалагічныя, матэрыяльныя, бытавыя і інш.); 3) шляхі вырашэння канфлікту, аптымальныя варыянты рашэння. Пры аналізе крытычных рабочых сітуацый студэнты «выконваюць» ролі бібліятэчных работнікаў і карыстальнікаў.

Для замацавання атрыманых ведаў распрацаваны гульні пад агульнай назвай «Бібліятэкар аддзела абслугоўвання».

Можна прапанаваць некаторыя прыёмы арганізацыі лабараторна- практычных заняткаў з выкарыстаннем алгарытмаў навучання. Напрыклад, відэазапіс прэзентацыі выставы адной кнігі. Працэдура праслухоўвання прэзентацыі можа быць групавой. Напярэдадні выкладчык дае схему аналізу запісаных прэзентацый. У схему аналізу ў залежнасці ад задач навучання ўключаюцца пытанні, звязаныя з ацэнкай структуры прэзентацыі, характарыстыкай кніг у аглядзе; пытанні, накіраваныя на засваенне ас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ноўных патрабаванняў да прэзентацыі, і інш. Функцыі выкладчыка пры самастойным аналізе студэнтамі прэзентацыі заключаюцца ў арганізацыі карэктнай зваротнай сувязі.

Пашырэнне практыкі работы бібліятэк па правядзенні вечароў кнігі патрабуе вызначанага драматургічнага рашэння, ставіць перад навучальным працэсам задачы фарміравання ў студэнтаў прафесійных уменняў сцэнарна-рэжысёрскага ўвасаблення тэмы вечара кнігі. Некаторыя магчымасці паглыблення падрыхтоўкі студэнтаў па пытаннях методыкі арганізацыі вечароў кнігі маюцца ў межах гадзін, вызначаных праграмай. Мы вылучаем вялікую колькасць гадзін на вывучэнне методыкі падрыхтоўкі і правядзення комплекснага масавага мерапрыемства. У лекцыйным курсе знаёмім студэнтаў з методыкай напісання сцэнарыя, напрыклад вечара кнігі, высвятляем асновы тэорыі драмы, раскрываем спецыфіку драматургічнай мовы вечара кнігі і класіфікацыю вечароў кнігі ў залежнасці ад формаў іх увасаблення, асаблівасцей сцэнарна-рэжысёрскага рашэння і інш. Найбольш аптымальным варыянтам фарміравання ўменняў і навыкаў сцэнарна-рыжэсёрскага бачання матэрыялу з'яўляецца самастойная падрыхтоўка кожнай падгрупай студэнтаў сцэнарыя вечарыны, афармленне яго ў адпаведнасці з метадычнымі патрабаваннямі. На працягу шэрага гадоў мы практыкуем заліковыя масавыя мерапрыемствы, якія рыхтуе кожная з вучэбных груп. Самастойнае ўвасабленне сцэнарыя з'яўляецца добрай школай фарміравання прафесійных уменняў і навыкаў. Папярэдняе размеркаванне роляў (рэжысёр, сцэнарыст, афарміцель, выканаўцы) дапамагае развіццю арганізацыйных уменняў і навыкаў, неабходных у свеце сучасных патрабаванняў да спецыяліста. Акрамя індывідуальных і групавых творчых заданняў, уяўляецца мэтазгодным наведванне масавых мерапрыемстваў, выкарыстанне метадычных прыёмаў, якія практыкуюцца ў працэсе навучання студэнтаў факультэта мастацкай творчасці, напрыклад вядзенне дзённіка назірання, у якім запісваюцца найбольш яскравыя ўражанні ад наведвання мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў важнае значэнне мае авалоданне імі крытыка-аналітычнымі метадамі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі. Напрыклад, дыспут – метад, выкарыстанне якога патрабуе комплексу ўменняў і навыкаў (праекціровачных, гнастычных, камунікатыўных, арганізацыйных). У методыцы падрыхтоўкі і правядзення дыспута вылучаюць этапы: фармулёўка тэмы, яе тэарэтычная адпрацоўка (выяўленне праблемнай сітуацыі, вызначэнне пытанняў для абмеркавання), работа з удзельнікамі, правядзенне дыспута. На кожным этапе вырашаюцца пэўныя спецыфічныя задачы, на якія арыентуецца педагог у фарміраванні прафесійных уменняў і навыкаў. Для таго, каб вызначыць тэму, цікавую для ўдзельнікаў, неабходны праекціровачныя ўменні і навыкі, важна валодаць метадамі вывучэння карыстальнікаў, умець арыентавацца ў патоку літаратуры. Гнастычныя ўменні патрэбныя на другім этапе падрыхтоўкі дыспута. Трэці этап звязаны з фарміраваннем у студэнтаў камунікатыўных і арганізацыйных уменняў. Ва ўзаемадзеянні з гнастычнымі ўменнямі яны дазваляюць арганізаваць рэкамендацыйныя гутаркі па тэме дыспута і блізкіх праблемах, г.зн. накіраваць карыстальніка. У працэсе правядзення дыспута важнае значэнне набываюць уменні і навыкі вядзення навуковай спрэчкі: валоданне асновамі фармальнай логікі, спосабамі доказаў і абвяржэнняў, этычнымі нормамі вуснага выступлення, уменнем пераканаць. Вызначаныя патрабаванні ў ходзе дыспута прад'яўляюцца да вядучага. Ён павінен добра ведаць праблемны аспект тэмы, якая абмяркоўваецца, і зыходзіць з узроўню падрыхтоўкі аўдыторыі, умець уважліва слухаць, валодаць методыкай уступнага і заключнага слова.

Авалоданне студэнтамі формамі і метадамі абслугоўвання карыстальнікаў будзе паспяховым, калі пры вывучэнні курса «Абслугоўванне чытачоў» устанаўліваюцца яго сувязі з іншымі прадметамі.